# ВЕКАПОМНЫЯ ДНІ: МЕДЫЙНАЯ АКТУАЛІЗАЦЫЯ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

***Т. У. Падаляк***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*tatsiana_pd@mail.ru*

Беларусь увайшла ў сусветную гісторыю як рэспубліка-партызанка. На акупаванай тэрыторыі разгарнулася маштабнае антыгерманскае супраціўленне. Гэта быў фронт у тыле ворага. Праз 80 гадоў пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўзмацняюцца спробы фальсіфікацыі гісторыі партызанскага руху, рэабілітацыі нацызму. Беларускія СМІ супрацьстаяць падтасоўкам ваеннай гісторыі. Інтэрнэт-праект «Партызаны Беларусі» (partizany.by), які ўвасабляе грунтоўную медыядакументалізацыю гісторыі, стаў значным укладам у захаванне гістарычнай памяці.

***Ключавыя словы***: гістарычная памяць; Вялікая Айчынная вайна; гераізацыя нацызму; інтэрнэт-праект «Партызаны Беларусі» (partizany.by).

# MEMORABLE DAYS: MEDIA ACTUALIZATION OF HISTORICAL MEMORY

***T. U. Padaliak***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: T. U. Padaliak (tatsiana_pd@mail.ru)*

Belarus entered world history as a partisan republic. Large-scale anti-German resistance developed in the occupied territories. This was the front behind enemy lines. Eighty years after the beginning of World War II, attempts to falsify the history of the partisan movement and rehabilitate Nazism are intensifying. National media oppose military history falsfication. The Internet project «Partisans of Belarus» (partizany.by), which embodies the fundamental media documentation of history, has become a significant contribution to the preservation of historical memory.

***Key words***: historical memory; The Great Patriotic War; glorification of Nazism; Internet project «Partisans of Belarus» (partizany.by).

2021–1941: 80-годдзе пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Для нацыянальных сродкаў масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь драматычная памятная дата стала дадатковай нагодай для медыйнай актуалізацыі гістарычнай памяці, недапушчэння гераізацыі нацызму і калабарацыянізму, фальсіфікацый, падтасовак, скажэнняў ваеннай гісторыі. Тэматычныя праекты рэспубліканскай патрыятычнай акцыі «Беларусь памятае» рэалізуюць усе буйныя СМІ краіны. Асаблівая ўвага надаецца ўшанаванню подзвігу партызан і падпольшчыкаў.

Беларусь увайшла ў сусветную гісторыю як рэспубліка-партызанка. Загадам гэтае пачэснае імя ўсталяваць немагчыма. На акупаванай тэрыторыі разгарнулася небывалае ў гісторыі – па маштабе і выніковасці – антыгерманскае супраціўленне. Масавы гераізм, самаадданасць і самаахвярнасць, прага да свабоды і незалежнасці былі велізарнай духоўнай сілай, якая ўздымала людзей на барацьбу. Гэта быў сапраўдны фронт у тыле ворага: каля 375 тыс. партызан, 70 тыс. падпольшчыкаў, амаль 400 тыс. чалавек у партызанскім рэзерве. Гэта быў фронт людзей, якім ніхто не аддаваў загад браць у рукі зброю, каб бараніць радзіму і бараніць жыццё. Палітыка нацызму на акупаванай тэрыторыі – масавае знішчэнне насельніцтва, генацыд: амаль кожнага трэцяга свайго жыхара страціла Беларусь у гады вайны. Хрэстаматыйныя факты, прапісныя ісціны? Аднак не спыняюцца тэндэнцыйныя памкненні перапісаць гісторыю з мэтай усталяваць «новы погляд» у тым ліку на беларускае супраціўленне нацызму, на партызанскі і падпольны рух. Метадалогія вядомая: не згадваць галоўнае, вызначальнае, сутнаснае і, наадварот, усяляк ухваляць, «узводзіць на п’едэстал» другараднае, эпізадычнае, неістотнае. Гэты феномен мы падрабязна аналізавалі ў кнігах «Вайна – самы страшны грэх: маральна-публіцыстычны дослед» [1], «Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі» [2].

У маі 2021 г. апублікаваны Закон Рэспублікі Беларусь «Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму». Сярод базавых прынцыпаў пазначаны: захаванне гістарычнай памяці і недапушчэнне фальсіфікацыі гісторыі, у тым ліку скажэнне гістарычных фактаў [3]. Такі дакумент, на наш погляд, неабходна было б прыняць нашмат раней, яшчэ ў СССР. У 1980-я гг. да судовай адказнасці пачалі прыцягвацца асобы, якія цесна супрацоўнічалі з гітлераўцамі, удзельнічалі ў масавых экзекуцыях-забойствах-здзеках з мірнага насельніцтва, ваеннапалонных, вязняў канцлагераў і гета, – аднак па розных прычынах змаглі пазбегнуць справядлівай расплаты за крывавыя злачынствы. Як, напрыклад,

хатынскі кат Рыгор Васюра. Гэта колішні начальнік штаба 118-га паліцэйскага батальёна СС, які ўдзельнічаў у знішчэнні вёскі Хатынь 22 сакавіка 1943 г. Да вайны Васюра скончыў Кіеўскае ваеннае вучылішча. Здаўся ў палон, вучыўся ў нямецкай школе прапагандыстаў, добраахвотна паступіў на службу ў 118-ы батальён. Пасля вайны яму ўдалося выдатна замаскіравацца, жыў у сяле Вялікая Дымерка Браварскага раёна Кіеўскай вобласці. Працаваў намеснікам дырэктара саўгаса, яго віншавалі з Днём Перамогі: значыўся як удзельнік вайны. Васюра прыдумаў добрую легенду: прызнаўся, што быў у палоне, служыў у немцаў – але не расстрэльваў, не спальваў. У 1952 г. ваенны трыбунал асудзіў Васюру на 10 гадоў, але ў 1955-м яго вызвалілі па амністыі. Толькі праз чатыры дзесяцігоддзі пасля заканчэння вайны ён сеў на лаву падсудных. Справу ў дачыненні Васюры разглядаў ваенны трыбунал Беларускай ваеннай акругі ў 1986 г. [4, с. 130–139]. Праз 80 гадоў пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны пераважная большасць злачынцаў-здраднікаў паўсталі ўжо перад Боскім судом…

У артыкуле «Идеологического объединения с внуками полицаев и теми, кто сегодня использует их символику, не будет», апублікаваным на старонках газеты «СБ. Беларусь сегодня» 16 ліпеня 2021 г., дэпутат Палаты прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь Сяргей Клішэвіч вёў размову аб неабходнасці ўсталявання памятнай даты – Дня партызан і падпольшчыкаў. Ён прапанаваў адзначаць гэты дзень 16 ліпеня, калі ў 1944 г. у Мінску прайшоў знакаміты партызанскі парад [5].

Ідэя ўсталявання гэтай памятнай даты неаднаразова абмяркоўвалася ў беларускім грамадстве. Варта, напрыклад, згадаць вялікі «круглы стол» «Векапомныя дні: фронт у тыле ворага» ў газеце «Звязда» 24 сакавіка 2012 г. з удзелам вядомых гісторыкаў, музейшчыкаў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Удзельнікі мерапрыемства звярнуліся да грамадскасці краіны з прапановай выказаць меркаванні адносна ініцыятывы аб усталяванні памятнай даты – Дня партызан і падпольшчыкаў. Публікацыя мела шырокі рэзананс-розгалас, чытачы актыўна падтрымалі газету, якая нагадала, што падобныя прапановы гучалі яшчэ ў 1960–1970-я гг., аднак на той час самі ўдзельнікі ваенных падзей не змаглі прыйсці да кансэнсусу адносна даты. Усе пагаджаліся: для даты трэба браць падзею, якая прызнаецца безапеляцыйна ўсімі і якая аб’яднала б усіх. Прапаноўвалася некалькі варыянтаў, сярод асноўных: 1) дата прыняцця Прысягі беларускага партызана (урачыстая клятва партызан змагацца супраць акупантаў да поўнага іх выгнання)

зацверджана на сумесным пасяджэнні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і ЦК КПБ 12 мая 1942 г., была апублікавана ў падпольнай газеце «Звязда» і выдадзена лістоўкамі тыражом 100 тыс. экзэмпляраў; 2) дата ўсталявання медаля «Партызану Айчыннай вайны» (Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 лютага 1943 г.); 3) дзень партызанскага параду ў Мінску 16 ліпеня 1944 года [1, с. 286].

Гісторык Вадзім Гігін згадаў яшчэ адну знакавую для гісторыі партызанскага руху падзею: «Свой первый бой партизанский отряд Василия Коржа, созданный на Пинщине, провел 28 июня. Может быть, к этой дате приурочить день партизанской славы?» [6]. Ён адзначыў, што «в Брянской области России уже есть такой праздник. Он приходится на 29 июня и связан с Директивой Совнаркома СССР и ЦК ВКП(б) партийным, советским, профсоюзным и комсомольским организациям создавать партизанские отряды и диверсионные группы для борьбы с немецкими войсками». Дадамо, у 2009 г. у Расіі быў прыняты федэральны закон аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у закон аб днях воінскай славы і памятных датах Расіі, дзе з’явілася яшчэ адна дата: 29 чэрвеня – Дзень партызан і падпольшчыкаў. На Браншчыне ўсталяваны і памятны медаль у гонар подзвігу партызан і падпольшчыкаў.

Значным унёскам у захаванне гістарычнай памяці стаў сумесны інтэрнэт-праект Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь «Партызаны Беларусі». Ён створаны з мэтай увекавечыць памяць пра народных мсціўцаў, партызан і падпольшчыкаў, якія змагаліся супраць нацызму ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама дзеля патрыятычнага выхавання моладзі, актывізацыі пошукавай працы. Гэта першы ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў праект, прысвечаны партызанскаму руху. У ходзе яго рэалізацыі алічбоўваюцца архіўныя дакументы, пастаянна папаўняецца база дадзеных. Інфармацыйны партал уключае індывідуальную картатэку партызан і падпольшчыкаў. Дастаткова зайсці на сайт partizany.by і набраць прозвішча сваяка ці знаёмага, назву партызанскага атрада – у тым выпадку, калі адпаведныя матэрыялы захаваліся ў архіве і ўжо алічбаваны, адразу з’явяцца на экране манітора. Пры гэтым інтэрактыўная персанальная картка партызана ўключае біяграфічныя звесткі, асабістыя дадзеныя (прозвішча, імя, год і месца нараджэння), прыналежнасць да партызанскага атрада, брыгады, узнагароды, адсканаваныя дакументы: асабістыя лісткі па ўліку кадраў, узнагародныя лісты, узнагародныя спісы, характарыстыкі і іншыя матэрыялы. Такім

чынам, інтэрнэт-праект «Партызаны Беларусі» ўвасабляе грунтоўную медыйную дакументалізацыю гісторыі.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Падаляк Т. У.* Вайна – самы страшны грэх: маральна-публіцыстычны даслед. Мінск: Выдавецкі дом «Звязда», 2014. 320 с.
2. *Падаляк Т. У.* Аксіялогія сучаснай беларускай журналістыкі; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў. Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2016. 263 с.
3. Аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму: Закон Рэсп. Беларусь // Звязда. 2021. 18 мая. С. 7.
4. *Падаляк Т. У.* Нашчадкі вогненных вёсак: дакументальныя нарысы, эсэ, успаміны. Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2009. 192 с.
5. *Клишевич С.* Идеологического объединения с внуками полицаев и теми, кто сегодня использует их символику, не будет // СБ. Беларусь сегодня. 2021. 16 июля. С. 6.
6. *Гигин В.* Памяти первых героев // СБ. Беларусь сегодня. 2021. 14 августа. С. 15.

## СТРАТЕГИЯ РЕЧЕВОГО ВОЗДЕЙСТВИЯ И «ЗНАК СОЦИАЛЬНОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА»

***А. В. Потребин***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*Potrebin@bsu.by*

Рассматривается сущность речевого воздействия журналистского творчества на аудиторию с учетом концепции речевой деятельности Л. С. Выготского. Обращается внимание на неизбежность социальной обусловленности медиаконтента, что влияет на методы и практику его подготовки журналистами. Рассмотрены стратегии речевого воздействия в экономической журналистике, которые проявляются в том числе в Telegram-каналах деловых СМИ. Сделан вывод о необходимости сочетания контент-анализа с качественным анализом медиатекстов.

***Ключевые слова:*** *ж*урналистика; речевое воздействие; медиаконтент; социальная обусловленность; Telegram-каналы; экономическая журналистика.